# ОБЗОРЫ И РЕЦЕНЗИИ

**Новікаў Сяргей Яўгеньевіч**
кандыдат гістарычных навук,
загадчык кафедры гісторыі
і сацыяльных навук

Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь
siarhnovikau@gmail.com

## УВЕКАВЕЧВАННЕ ПАМЯЦІ ПРА ШОА Ў МІНСКУ І МАЛЫМ ТРАСЦЯНЦЫ

Pohl, G. Nikto ne zabyt, nishto ne zabyto? Memorialisierungen der Erinnerung an die Shoa in Minsk und Maly Trascjanec. Masterarbeit zur Erlangung des Akademischen Grades Master of Arts (M.A.) / Gundula Pohl. – Potsdam: Universität Potsdam, 2020. – 115 S.

Магістарская работа Гундулы Поль (Gundula Pohl) была не толькі бліскуча абаронена на філасофскім факультэце Інстытута славістыкі ў канцы снежня 2020 г., але і узнагароджана першай прэміяй Патсдамскага ўніверсітэта па выніках конкурсу на лепшае даследаванне сярод работ такога кшталту.

Даследаванне прысвечанае важным аспектам гісторыі мемарыялізацыі трагедыі яўрэйскага народа на прыкладзе месцаў ушанавання памяці ў Мінску і Малым Трасцянцы. Скрупулёзны аналіз грамадскага і дзяржаўнага наратываў, якія складаліся ў пасляваенны перыяд і асабліва на цяперашнім этапе развіцця суверэннай Рэспублікі Беларусь, практычна ўпершыню апынуўся ў фокусе спецыяльнага навуковага даследавання, часткова вядомага беларускім гісторыкам дзякуючы публікацыям аўтара[1].

Даследчыца праз сваю навуковую працу[2] знаёміць нямецкага чытача з аўтарскім падыходам да вывучэння вынікаў мемарыялізацыі, якая датычылася адной з малавядомых у савецкай гістарыяграфіі тэмы знішчэння яўрэяў у горадзе Мінску і яго ваколіцах у гады нацысцкай акупацыі сталіцы Беларускай ССР. У выніку Г. Поль удалося разгарнуць паказ розных аспектаў савецкага і сучаснага працэсаў мемарыялізацыі трагедыі яўрэйскага народа

[1] *Поль, Г.* Мыслить в национальных категориях: “Массив имен” как мемориал “Австрийским жертвам Холокоста” / Г. Поль // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 3 крас. 2020 / Мінск. дзярж. лінгвіст. ун-т ; рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2021. – Вып. 19. – С. 55–65;

*Поль, Г.* Малый Тростенец в измерении научного анализа / Г. Поль // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 2 крас. 2021 / Мінск. дзярж. лінгвіст. ун-т ; рэдкал.: А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: МДЛУ, 2022. – Вып. 20. – С. 30–34.

[2] *Pohl, G.* Nikto ne zabyt, nishto ne zabyto? Memorialisierungen der Erinnerung an die Shoa in Minsk und Maly Trascjanec. Masterarbeit zur Erlangung des Akademischen Grades Master of Arts (M. A.) / Gundula Pohl. – Potsdam : Universität Potsdam, 2020. – 115 S.

на беларускай зямлі ў дачыненні як да мясцовых, так і еўрапейскіх яўрэяў, прывезеных для мэтавага знішчэння ў Мінску і яго ваколіцах. Адметнай рысай магістарскага даследавання можна вызначыць успрыманне аўтарам існуючых на месцах знішчэння помнікаў скрозь прастору рэпрэзентацыі, а таксама ў адпаведнасці з катэгорыямі фарміравання месца памяці (S. 4). Аўтар спрабуе практычна ўпершыню правесці навуковае асэнсаванне даследчыцкай праблематыкі, а таксама ўбачыць помнікі манументальнага мастацтва ва ўсёй іх шматмернасці, то бок прадставіць перад наведвальнікам якасна новы ўзровень аналізу мінулага з улікам захавання рэальнага гістарычнага кантэксту. У сваю чаргу аўтару гэтых радкоў хацелася б звярнуць увагу чытача на тое, што гэтая праца, выкананая на нямецкай мове, арыентаваная пакуль выключна на нямецкамоўную чытацкую аўдыторыю, хаця яе выкарыстанне будзе надзвычай карысным для беларускіх музейных работнікаў, студэнтаў і школьнікаў, асабліва спецыялістаў у сферы ваеннага турызму Беларусі, не кажучы пра яе бясспрэчную незаменнасць для прафесійных гісторыкаў Вялікай Айчыннай вайны.

Зацікаўлены беларускі чытач можа выказаць пытанне адносна аўтарскай тэзы "аб незаменнасці" даследавання Г. Поль для сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, асабліва крыніцазнаўства. Падставай для пастаноўкі такога пытання можна лічыць дакументальныя напрацоўкі і навуковыя працы, падрыхтаваныя у апошнія гады беларускімі архівістамі, гісторыкамі, даследчыкамі ў дачыненні да месцаў памяці пра яўрэяў у Мінску[1] і Трасцянцы[2],

[1] Judenfrei! Свободно от евреев: История минского гетто в документах / автор-сост. Р. А. Черноглазова. – Минск : Асобны Дах, 1999. – 432 с.

[2] Тростенец / сост. С. В. Жумарь, Р. А. Черноглазова. – Минск : ГК «Полиграфоформление», 2003. – 103 с.; Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.]; под ред. Г. Д. Кнатько. – Минск : НАРБ, 2003. – 292 с.; Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.] ; редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыпл. Імя П. Броўкі, 2016. – 520 с.

*Яцкевіч, Н. А.* Трагедыя народаў Еўропы = Тростенец. Трагедия народов Европы = Trastsianets. The tragedy of the peoples of Europe / Н. А. Яцкевіч, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 128 с.

*Кошман, В.* Да пытання аб ідэнтыфікацыі ахвяр лагера Малы Трасцянец (па матэрыялах археалагічных даследаванняў) / В. Кошман // Беларускі гістарычны часопіс. – 2020. – № 5. – С. 4–11.

*Кошман, В. И.* Фалеристический материал с места массового уничтожения населения в урочище Благовщина (Малый Тростенец) в 1942–1943 гг. / В. И. Кошман // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2021. – Т. 66. – № 4. – С. 432–442.

*Новікаў, С. Я.* Мінскае гета і Малы Трасцянец: новае даследаванне / С. Я. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 3. – С. 25–34.

*Новікаў, С.* Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 10. – С. 27–34.

*Новікаў, С.* Ліквідацыя слядоў масавых нацысцкіх злачынстваў у Беларусі ў 1943–1944 гг.: да пытання аб дзейнасці «зондэркаманды 1005-Цэнтр» / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2019. – № 5. – С. 3–13.

*Новікаў, С.* Праблематыка нацысцкага генацыду ў раёне вёскі Малы Трасцянец у 1942–1944 гадаў у святле найноўшых і ранейшых даследаванняў // С. Новікаў / Przeglad Srodkowo-Wschodni. – 2019. – Nr. 4. – P. 523–556;

*Новікаў, С.* Аб'ектыўнае канструяванне мінулага – бясспрэчная аксіёма гістарычнай навукі / С. Новікаў // Беларуская думка. – 2022. – № 11. – С. 81–89.

а таксама нямецкімі гісторыкамі[1]. Аднак ні адна са згаданых работ не разглядала месцы памяці ў Мінску і Трасцянцы ў ракурсе, вызначаным нямецкай даследчыцай.

Рэцэнзуемая праца прысвечана надзвычай актуальнай па цяперашні дзень праблематыцы – праблемам мемарыялізацыі гістарычных падзей, якія ў савецкі час практычна заставалася па-за ўвагай афіцыйнай гістарыяграфіі[2]. Таму не з'яўляецца выпадковым, што ў даследаванні Г. Поль праводзіць навуковы аналіз вынікаў мемарыялізацыі аб'ектаў памяці ў Мінску і Малым Трасцянцы, звязаных з трагедыяй яўрэйскага насельніцтва Беларусі, а таксама Аўстрыі, Германіі, Чэхіі. Імпануе навуковая пазіцыя нямецкай даследчыцы, якая ставіць перад сабой вельмі адказныя задачы па максімальна поўным аналізе гістарычнага мінулага з мэтай рэканструявання фактычных падзей, звязаных з захаваннем памяці ў такіх "месцах памяці", як Мінскае гета (S. 23) і Малы Трасцянец (S. 45).

Адразу ж заўважым, што ў сваім даследаванні нямецкі аўтар выкарыстоўвае ў якасці абагульненай назвы геаграфічны тэрмін, то бок назву вёскі Малы Трасцянец, побач з якім цягам 1942–1944 гг. знаходзіўся лагер прымусовага ўтрымання вязняў і іх выкарыстання ў якасці працоўнай сілы, тады як у афіцыйных дакументах Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, якая працавала на месцах масавага знішчэння людзей у раёне вёскі Малы Трасцянец, ужываюцца асобныя назвы, сярод якіх: урочышча Благаўшчына як месца масавых расстрэлаў каля вёскі Вялікі Трасцянец, урочышча Шашкоўка як месца масавага знішчэння і спальвання людзей, а таксама сам лагер, які знаходзіўся побач з вёскай Малы Трасцянец. Інакш кажучы, пад назвай "Трасцянец" у сучаснай беларускай гістарыяграфіі замацаваны ўсе

[1] *Kohl, P.* Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente / P. Kohl. – Dortmund : IBB GmbH, 2003. – 111 S.

*Hoffmann, J.* „Das kann man nicht erzählen". "Aktion 1005". Wie die Nazis die Spuren ihrer Massenmorde in Osteuropa beseitigen / J. Hoffmann. – Hamburg; Fulda : Fuldaer Verlagsanstalt, 2008. – 432 S.

*Ewe, G.* Maly Trostinez heute begegnen / G. Ewe // Im Schatten von Auschwitz. Spurensuche in Polen, Belarus und der Ukraine: Begegnen, Erinnern, Lehren / Hrsg. von Martin Langebach und Hanna Liever. – Bonn : BPB; 2017. – S. 332–349.

*Rentrop, P.* Tatorte der „Endlösung". Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin : Metropol, 2011. – 256 S.

*Rentrop-Koch, P.* Maly Trostinez – ein Landgut als Vernichtungsstätte / P. Rentrop-Koch // Im Schatten von Auschwitz. Spurensuche in Polen, Belarus und der Ukraine: Begegnen, Erinnern, Lehren / Hrsg. von Martin Langebach und Hanna Liever. – Bonn : BPB, 2017. – S. 152–169.

*Янеке, К.* Официальные германо-белорусские отношения 1990 – 2019 гг. в зеркале развития места памяти «Тростенец» / К. Янеке // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 5 крас. 2019 / Мін. дзярж. лінгвіст. ун-т ; рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : МДЛУ, 2022. – Вып. 18. – С. 4–13.

[2] *Раманоўскі, В. П.* Трасцянецкі лагер смерці / В. П. Раманоўкі // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945 : Энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1990. – С. 590.

пералічаныя вышэй месцы масавага знішчэння, а не адно з іх – каля вёскі Малы Трасцянец. Таму аўтар рэцэнзуемай працы, на наш погляд, прытрымліваецца падыходу, уведзенаму у дачыненні да гэтага месца знішчэння яшчэ ў канцы нулявых гадоў П. Рэнтрап[1], тады як урочышча Благаўшчына, па меркаванні яе самой, з'яўлялася "да восені 1943 г. цэнтральным месцам знішчэння мінскага СД" (S. 576). Гэта азначае, што Г. Поль праз гэтую назву значна звужае прадмет свайго даследавання, лакалізуючы яго толькі вёскай Малы Трасцянец. Насамрэч, у магістарскай працы разгледжаны ўсе гістарычныя "месцы памяці" – каля Вялікага і Малога Трасцянца (S. 45–50), урочышча Шашкоўка (S. 50–64) і ўрочышча Благаўшчына (S. 65–75).

Аналіз магістарскай працы Г. Поль паказвае, што ў нямецкай гістарыяграфіі на цяперашні час з'явілася спецыяльнае даследаванне па культуры памяці ў Беларусі. Гэта азначае, што беларускай навуковай грамадскасці, турыстычным фірмам, музейным супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама школьным экскурсаводам ў музейнай экспазіцыі "Трасцянец" у сярэдняй школе вёскі Вялікі Трасцянец пасля выхаду ў свет новай працы на тэму ўшанавання памяці аб трагедыі яўрэяў у Мінску і яго ваколіцах неабходна выкарыстаць новыя ацэнкі на гістарычныя падзеі ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы, вучэбнай і выхаваўчай працы, экскурсійнай практыцы, грамадскім і дзяржаўным дыскурсах.

Даследаванне ўключае шэсць частак: уводзіны (S. 1–10), частку 2 "Памяць пра вайну і Шоа ў Беларусі" (S. 11–18), частку 3 "Аналітычныя рамкі і мемарыял" (S. 19–22), частку 4 "Аналіз месцаў памяці" (S. 23–75), заключэнне (S. 76–85) і бібліяграфію (S. 86–98), а таксама дадаткі (S. 99–108). Апроч таго, структуру складаюць сузмесце, пералік фота і спіс табліц, прынятыя скарачэнні. Базу крыніц для даследавання тэмы складаюць апублікаваныя дакументы рознага паходжання, а таксама інтэрв'ю і стрымлайн-экскурсіі, у тым ліку віртуальны ўдзел Г. Поль у 4-гадзіннай экскурсіі аўтара гэтых радкоў па тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу Трасцянец.

Разгляд навуковай распрацоўкі гэтай тэмы нямецкімі і беларускімі гісторыкамі прыводзіць даследчыцу да высновы аб тым, што ў распачатай ў першыя гады пасля вызвалення беларускай тэрыторыі працы партыйных і дзяржаўных органаў у Беларускай ССР па ўвекавечанні знамянальных месцаў і падзей, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, памяць пра Шоа ці катастрофу яўрэяў так і не заняла свайго належнага месца, пра што сведчылі вынікі гэтай дзейнасці на прыкладзе Мінскага гета і Малога Трасцянца як месцаў Катастрофы. Аўтар прыходзіць да высновы, што гэтая тэма доўгі час ігнаравалася (S. 2). Са спасылкай на два новых нямецкіх даследаванні, прысвечаных культуры памяці ў Беларусі, у тым ліку Маламу Трасцянцу,

[1] *Rentrop, P.* Maly Trostinez / P. Rentrop // Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager. In 10 Bände. Bd. 9. – München : C. H. Beck, 2009. – S. 573–587.

аўтар канстатуе, што да гэтага часу ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі адсутнічае праца пра архітэктурную забудову у Мемарыяльнага комплекса Трасцянец, адкрытага летам 2015 г. (S. 7).

У другой частцы ўводзін Г. Поль раскрывае гістарычны кантэкст гэтых месцаў дзеянняў (S. 7–10). Яна акцэнтуе ўвагу на дакладных звестках, датычных Мінскага гета і Малога Трасцянца. З апорай на дакументальныя звесткі ў працы паказана агульна колькасць ахвяр, якія загінулі на месцах масавага знішчэння яўрэяў Мінскага гета на тэрыторыі самога гета, у раёне цагельнага завода ў Тучынцы, у час пагрому на пурым 2 сакавіка 1942 г., а таксама ва ўрочышчы Благаўшчына на працягу часу з лета 1941 г. па кастрычнік 1943 г., у тым ліку 6937 яўрэяў, дэпартаваных з Гамбурга, Дюсельдорфа, Франкфурта-на-Майне, Берліна, Брно, Брэмена і Вены. Такую ж карціну даследчыца малюе ў дачыненні да Малога Трасцянца, да якога прыводзіць звесткі Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, паводле якой агульная колькасць ахвяр, забітых у гэтым раёне, вагалася ад 206,5 тыс. да 546 тыс. тады як нямецкія даследчыкі па грубых падліках дапускаюць забойства каля 60 тыс. чалавек (S. 10).

У трэцяй главе магістр вызначае рамкі аналізу для паказу канкрэтных аб’ектаў памяці на прыкладзе Мінскага гета і Малога Трасцянца. Для нагляднага прадстаўлення кожнага з іх аўтар прапануе табліцу 2 “Дэфініцыі прасторы памяці” (S. 20). З яе вынікае, што даследчыца вылучае асобныя прасторы памяці – Мінскае гета і Малы Трасцянец; канкрэтызуе месцы памяці, якімі ў першым выпадку з’яўляюцца яма, дзе адбыўся расстрэл на яўрэйскае свята пурыму 2 сакавіка 1942 г., былыя яўрэйскія могілкі на тэрыторыі гета, помнікі на Юбілейнай плошчы і ў Тучынцы. У другім выпадку месцамі памяці з’яўляюцца помнікі савецкага часу, аб’екты мемарыялізацыі ў ходзе правядзення будаўнічых работ у час першай чаргі і ў час другой чаргі. У якасці вынікаў мемарыялізацыі аўтар называе на Яме – чорны пасляваенны абеліск, 27 безыменных фігур, знак міноры, алея праведнікаў; на месцы яўрэйскіх могілак – пантэон памяці аб нямецкіх, аўстрыйскіх і чэшскіх яўрэях, разбіты ачаг, надмагільныя камяні; на Юбілейнай плошчы – памятны камень; у Тучынцы – памятны камень. На прыкладзе Малога Трасцянца гэты аналіз зводзіцца да наступнага. Аб мемарыялізацыі савецкіх часоў нагадваюць два памятныя камяні і абеліск памяці калы вёскі Вялікі Трасцянец; першая чарга будаўнічых работ пакінула наступныя аб’екты – шлях памяці, врана памяці, масіў імёнаў і аб’ект у Шашкоўцы; будаўнічыя работы ў час другой чаргі пакінулі лес памяці, шлях смерці і ямы-магілы.

У аснову аналізу нямецкі аўтар паклала мадэль па адаптацыі прасторы французскім сацыёлагам А. Лефеврам: прастора, якую пазнаюць; прастора, якую ўяўляюць; прастора, якую перажываюць (S. 22). Пры дапамозе канкрэтных катэгорый аналізу можна вывучыць тры аспекты памяці: фізічны, дыскурсіўны, сацыяльны. Выкарыстанне такіх метадалагічных падыходаў дало аўтару магчымасць прыйсці да важнай высновы аб тым, што адапта-

ваная да жыцця мадэль А. Лефеўра дазваляе ўбачыць любы помнік у яго шматмернасці і прасторы. Вылучэнне асобных аспектаў паказвае падабенства ці адрозненні ад іншых помнікаў (S. 22).

У чацвёртай частцы "Аналіз месцаў памяці" (S. 23–75) прадстаўлены вынікі навуковага даследавання на прыкладзе 7 аб'ектаў памяці, пачынаючы ад прасторы памяці "Яма" да прасторы памяці "Малы Трасцянец".

У першым выпадку праведзены аналіз гісторыі ўзнікнення і форм захавання памяці на прыкладзе Ямы, яўрэйскіх могілак, памятнага каменя на Юбілейнай плошчы і памятнага каменя ў Тучынцы. Заўважым, што кожнае з названых месцаў замацавана на фота, сабраных у спецыяльным дадатку з 20 фотаздымкаў.

У працы даследчыца паказвае гістарычнае значэнне месца знішчэння яўрэяў Мінскага гета на пурым 2 сакавіка 1942 г. у кантэксце культуры памяці яўрэйскага народа, адзначае той факт, што Яма на цяперашні час стала сімвалам для ахвяр Мінскага гета ў гады нацысцкай акупацыі (S. 29). Асаблівае значэнне гэтаму месцу было нададзена ў 1946 г., калі на месцы трагедыі быў усталяваны першы ў СССР помнік загінуўшым у гады вайны яўрэям. Ад сябе дададзім, што аўтарамі былі беларускі яўрэйскі паэт Хаім Мальцінскі і добра вядомы ў пасляваенным горадзе каменацёс Мордух Спрышэн. Помнік быў выкананы на ідыш і рускай мовах. Іх эстафету па мемарыялізацыі працягнуць амаль праз паўстагоддзя бліскучы беларускі архітэктар Леанід Левін і ізраільскі скульптар Эльза Полак, якія разам з беларускім скульптарам Аляксандрам Фінскім стварылі скульптурную кампазіцыю "Апошні шлях" у Мемарыяле ахвярам Халакосту "Яма"[1]. Менавіта тут, як адзначае Г. Поль, Кіраўнік рэспублікі А. Р. Лукашэнка ў сваёй прамове з нагоды 65-х угодкаў ліквідацыі Мінскага гета ў кастрычніку 2008 г. выказаў думку аб неабходнасці захавання памяці аб гэтай трагедыі і стварэнні ў Трасцянцы "велічнага мемарыялу памяці еўрапейскага значэння" (S. 30, 51).

Другім месцам памяці, які даследуе нямецкі гісторык, з'яўляюцца былыя яўрэйскія могілкі – цяперашні яўрэйскі парк памяці (S. 33–41). Г. Поль прасочвае гісторыю гэтага памятнага месца. Гэта трэцяе месца пахаванняў у Мінску сярэдзіны XIX ст., якое праіснавала фактычна да канца Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку 1990-х гг. тут было створана месца памяці пра дэпартаваных з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі яўрэяў, забітых да канца германскай акупацыі ў Мінску і каля вёскі Малы Трасцянец. Пантэон памяці быў завершаны ўстаноўкай у 2015 г. памятнага камня з Чэхіі, тым самым было скончана стварэнне месца памяці (S. 34). Другім элементам мемарыялізацыі, як яго называе даследчыца, з'яўляецца "Разбураны ачаг" ці "Стол і стул", створаны па эскізах Л. Левіна і М. Петруля,

[1] *Герстен, Б. И.* Память народа. Хроника Минского гетто / Б. И. Герстен, В. В. Болкун. – Минск : Народная асвета, 2022. – С. 97–99 .

і адкрыты ў кастрычніку 2008 г. на 65-я ўгодкі ліквідацыі Мінскага гета. Трэцім элементам месца памяці ў працы прыведзены надмагільныя камяні, сабраныя ў яўрэйскім парку памяці. Г. Поль адзначае, што гэтыя аб’екты былі вернутыя ў культуру памяці дзякуючы выключана грамадскім намаганням яўрэйскай абшчыны, якія былі падтрыманы гарадскім кіраўніцтвам (S. 35). Важным фактам даследавання з’яўляецца табліца 4, якая адлюстроўвае храналогію падзей па мемарыялізацыі памяці аб дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў у Мінск у канцы 1941 года.

Завяршаюць гэтую частку даследавання матэрыялы аб помніках на Юбілейнай плошчы ў Мінску і каля былой вёскі Тучынка, дзе перад вайной знаходзіліся два цагельных заводы. На першым месцы памяці мемарыялізавана трагедыя Мінскага гета, дзе ў гады нацысцкай акупацыі загінула каля 100 тыс. чалавек. Частка з іх у ходзе пагромаў была забіта за 7 км ад Мінска, каля былых ям, дзе здабывалася гліна для вытворчасці цэглы. Як адзначае аўтар, у раёне вёскі Тучынка было забіта каля 14 тыс. чалавек, пра што на сённяшні дзень сведчаць памятныя надпісы на чатырох мовах – англійскай, беларускай, рускай і ідыш. Іх стваральнікам з’яўляўся Л. Левін разам з іншымі архітэктарамі і скульптарамі (S. 44).

У другой частцы раздзела размова ідзе пра прастору памяці пад назвай Малы Трасцянец (S. 45–75). У ёй прадстаўлены вынікі мемарыялізацыі ў савецкі час, калі каля вёсак Вялікі і Малы Трасцянец былі адкрыты памятныя месцы: першае з іх абеліск каля вёскі Вялікі Трасцянец, дзе памятны надпіс утрымлівае звесткі пра 201 500 ахвяр, мірных грамадзян, партызан і савецкіх ваеннапалонных, забітых нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941–1944 гг. (S. 47). У параўнанні з двума помнікамі, адзін з якіх быў пастаўлены каля вёскі Малы Трасцянец у 1965 г. і рэканструяваны у 2015 г., а другі – ва ўрочышчы Шашкоўка ў 1966 г., на іх адсутнічаюць дакладныя звесткі аб колькасці ахвяр. Гэты аспект адзначае нямецкая даследчыца ў сваёй працы (S. 47) і падкрэслівае, што кожны помнік знаходзіцца на гістарычным месцы, інакш кажучы, фарміруе адэкватнае ўспрыманне месца памяці, чаго нельга сказаць пра абеліск каля вёскі Вялікі Трасцянец. У сувязі з узвядзеннем Мемарыяльнага комплексу Трасцянец гэты помнік згубіў свае значэнне (S. 49).

Рашэнне аб стварэнні мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы, як адзначае ў даследаванні Г. Поль, было прынята на дзяржаўным узроўні яшчэ ў чэрвені 1994 года. У пачатку нулявых гадоў і цягам першага дзесяцігоддзя былі праведзены конкурсы па мемарыялізацыі трагедыі ў раёне вёскі Малы Трасцянец. Вынікам апошняга з іх, заключны этап якога адбыўся вясной 2010 г., з’явілася скульптурная кампазіцыя “Брама памяці” архітэктара К. Касцючэнка. Даследчыца адзначае, што закладка памятнай капсулы з нагоды пачатку будаўнічых работ у рамках першай чаргі мемарыялізацыі ў Трасцянцы адбылася з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі 8 чэрвеня

2014 г. недалёка ад вёскі Малы Трасцянец побач з тэрыторыяй былога працоўнага лагера. Праз год, 22 чэрвеня 2015 г., з удзелам кіраўніка дзяржавы, замежных гасцей і шырокай грамадскасці адбылося адкрыццё першай чаргі Мемарыяльнага комплексу Трасцянец (S. 52). Адкрыццё незавершанага будаўніцтва першай чаргі мемарыяльнага комплексу каля вёскі Малы Трасцянец з'явілася для кіраўніцтва дзяржавы добрай паставай для заявы, што дзякуючы гэтаму Беларусь з'явілася на “карце еўрапейскага турыстычнага маршруту па гісторыі Халакосту” (S. 65). Пры гэтым аўтар даследавання звяртае ўвагу, што ў ходзе мемарыялізацыі трагічных падзей ваеннай гісторыі была захавана савецкая парадыгма па фарміраванні месца памяці, на якім цалкам адсутнічаюць элементы яўрэйскай гісторыі і культуры, але пры гэтым дамінуючай прыкметай становіцца не савецкая, а беларуская традыцыя ўшанавання памяці пра трагічныя старонкі ваеннага мінулага (S. 65).

Заключным элементам гэтай часткі з'яўляецца аналіз новага помніка “Масіў імёнаў”, канцэпцыя якога была прадстаўлена беларускай грамадскасці ў лютым 2019 г. у ўстанове вышэйшай адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” (у рукапісу Г. Поль памылкова прыводзіцца дата 22 лютага 2009 г. – *С. Н.*). Сутнасцю новага мемарыяла з'яўляліся 10 асобных памятных камянёў вышынёй каля 3 метраў і шырынёй каля 1 метра, на якіх у сярэдняй частцы прыведзена каля 1 тыс. імёнаў, якія ўвасабляюць у сабе індывідуальную, але не асабістую памяць пра аўстрыйскіх ахвяр Шоа ў Беларусі. Нагадаем, што размова ідзе пра 13 500 яўрэяў, вывезеных у Мінскі раён і ў раён Трасцянца толькі з адной мэтай – іх расстрэлу. На думку аўстрыйскага архітэктара і скульптара Даніэля Занвальда, на гэтым месцы павінен быць пастаўлены помнік, які нагадваў бы пра трагедыю яўрэяў, і яны больш не заставаліся бы безыменнымі ахвярамі Халакосту, надалей пазбаўленымі забыцця (S. 65). У гэтым кантэксце на вышэйзгаданай канферэнцыі беларускі архітэктар Г. Левіна, якая пасля смерці бацькі працягвае яго справу па мемарыялізацыі Шоа ў Мінску і Трасцянцы, прапанавала побач з гэтым помнікам паставіць помнік “Масіў невядомых імёнаў” тым, хто да гэтага часу застаецца невядомым, але забітым у гады нацысцкай акупацыі. Аднак гэтая ідэя, як піша магістрант, не знайшла падтрымкі з аўстрыйскага боку.

У заключнай частцы чацвёртага раздзела Г. Поль распавядае пра другую чаргу будаўніцтва Мемарыяльнага комплексу Трасцянец ў раёне ўрочышча Благаўшчына (S. 65–75). Як адзначае аўтар, у канцы 1950-х гг. тут пачалася не мемарыялізацыя, а занядбанне гэтага месца трагедыі, дзе паводле даных Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі было забіта 150 тыс. чалавек. Побач з гэтым месцам пачалі ствараць гарадскую звалку. Таму не дзіўна, што толькі ў 2002 г. па ініцыятыве яўрэйскай абшчыны быў усталяваны невялікі помнік побач з месцам масавага знішчэння ў 1941–1943 гадах. Другім важным аб'ектам памяці ў гэтым месцы памяці з 2010 г. становіцца лясны масіў, які быў выкарыстаны прадстаўнікамі аўстрыйскай грамадскай ініцыятывы

IM-MER MALVINA (на нямецкай мове гэтае скарачэнне азначае ‘ініцыятыва Мальвіна’. Так звалі бабулю В. Бартон – арганізатара гэтага пачынання, памятаць Малы Трасцянец. – *С. Н.*) для ўшанавання памяці, калі штогод у невялікім сасновым ляску каля месцаў расстрэльных ям на дрэвах вывешваліся жоўтыя ламіраваныя лісты памерам А4 з імёнамі тых, каго вывезлі з Вены толькі з адзінай мэтай – іх забойства як яўрэяў. Апроч таго, распачалася грамадская дзейнасць па стварэнні мемарыяла аўстрыйскім яўрэям, які быў адкрыты у рамках агульнай канцэпцыі мемарыяла не ва ўрочышчы Благаўшчына, то бок на месцы расстрэлаў 13 500 аўстрыйскіх яўрэяў, а каля працоўнага лагера побач з вёскай Малы Трасцянец, пра што ў тэксце ішла гаворка вышэй.

Аналізуючы аб’екты другой чаргі будаўнічых работ у раёне ўрочышча Шашкоўка, аўтар спыняецца на галоўнай з іх, паводле афіцыйнай канцэпцыі яна называецца “Дарога смерці”. Да яе ў гарызантальнай плоскасці прымыкаюць лясны масіў з жоўтымі таблічкамі і гістарычнае месца расстрэлаў. Магістр адзначае, што такое спалучэнне вылучае другую чаргу, паколькі ў ходзе будаўніцтва першай чаргі галоўнай дамінантай там з’яўлялася Брама памяці, хоць і ў аб’ектах другой чаргі назіраецца пэўная перавага вагонаў і тэмы дэпартацыі яўрэяў з Еўропы ў раён Трасцянца, якой з вясны 1942 г. становіцца цэнтральным месцам знішчэння яўрэяў на тэрыторыі Беларусі. У выніку аналізу прасторавых і функцыянальных месцаў памяці нямецкая даследчыца канстатуе, што адсутнасць запланаваных скульптурных элементаў на “плошчы парадоксаў”, а таксама імянных спісаў з дэпартаванымі яўрэямі ў вагонах, стварыла падставы для ўзнікнення прабелаў у культуры памяці на канкрэтных месцах памяці (S. 75).

У заключэнні Г. Поль падводзіць вынікі даследавання і адзначае, што з пачатку нулявых гадоў у фокусе сучаснага грамадскага дыскурсу ў Беларусі стала знаходзіцца тэматыка Шоа, у значнай ступені мемарыялізаваная сродкамі манументальнага мастацтва ў Мінску і Малым Трасцянцы (S. 78). У якасці навуковых высноў даследчыца прыходзіць да наступных тэзісаў: 1) помнікі ахвярам Шоа ствараліся ў першую чаргу дзякуючы грамадскім ініцыятывам. На фоне таго, што дзяржаўныя інстытуцыі надавалі гэтаму свае тлумачэнне, сродкамі мемарыялізацыі грамадскім акторам ўдавалася захаваць асобныя элементы людскіх успамінаў (S. 78); 2) хоць у працэсе фарміравання месцаў памяці і стварэння архітэктурных манументаў відавочна з аднаго боку прысутнічалі мультынацыянальныя сувязі і агульныя дзеянні, з другога боку станавіліся вызначальнымі катэгорыі нацыянальнай памяці і памкненні да захавання ўласных месцаў памяці (S. 80); 3) памяць пра Шоа выкарыстоўвалася як сродак палітычнага ўзаемадзеяння і як крытэрый для дасягнення пэўных мэтаў з боку беларускай дзяржавы (S. 82).

Апроч гэтых тэзісаў Г. Поль выказвае слушныя думкі адносна працягу навуковых дыскусій у дачыненні да мемарыялізацыі памяці аб Шоа ў

Мінску і Малым Трасцянцы. Пры гэтым важна звяртаць увагу з аднаго боку на архітэктурную эстэтыку помнікаў на месцах памяці, а з другога – на выкарыстанне розных сродкаў, у тым ліку правядзенне віртуальных экскурсій турыстычнымі фірмамі і Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пры даследаванні варта не пакідаць без увагі адну з цэнтральных фігур – Л. М. Левіна, дзякуючы якому быў істотна зменены ландшафт памяці ў Беларусі ўвогуле і ў дачыненні да захавання гісторыі Шоа ў прыватнасці. Вузлавым элементам такой працы можа заставацца Гістарычная майстэрня імя Леаніда Левіна ў Мінску, якая за 20 гадоў свайго існавання вельмі шмат зрабіла на ніве мемарыялізацыі памяці пра Шоа ў Мінску і Трасцянцы.

Такім чынам, з'яўленне нямецкамоўнага даследавання ставіць на парадак дня беларускай гістарычнай навукі і музейнай практыкі прынцыпова важныя пытанні, якія ў сувязі 80-мі ўгодкамі ліквідацыі Мінскага гета і слядоў злачынстваў па масавым знішчэнні грамадзянскага насельніцтва, у тым ліку яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, партызан і падпольшчыкаў Мінска і навакольных населеных пунктаў, а таксама савецкіх ваеннапалонных ва ўрочышчы Благаўшчына набываюць асаблівае гучанне. Галоўны адказ на іх будзе заключацца ў тым, якім чынам і ў якой ступені замежная навуковая распрацоўка стане фактам айчыннай, у першую чаргу беларускай гістарыяграфіі, знойдзе адлюстраванне ў канцэпцыі экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і будзе выкарыстоўвацца ў індывідуальных тэкстах экскурсій для турыстаў з еўрапейскіх краін.

Ад сябе хацелася б працягнуць пералік першачарговых задач па ўшанаванні памяці трагедыі беларускага народа, як пра гэта сведчыць рэканструкцыя Мемарыяльнага комплексу Хатынь у сувязі з 80-годдзем гістарычнай трагедыі[1]. У дачыненні да мемарыялізацыі месцаў памяці ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец было б вельмі пажадана, каб у рэшце рэшт завяршыліся будаўнічыя работы адпаведна распачатай у сярэдзіне 2010-х гг. рэканструкцыі аб'ектаў першай чаргі ва ўрочышчы Шашкоўка, а таксама былі праведзены работы па інсталяцыі кожнага з запланаваных элементаў "Апошняга шляху" ва ўрочышчы Благаўшчына. Не менш важная задача стаіць і перад беларускай гістарычнай навукай, каб не знікаў інтарэс да гістарычных падзей у раёне Трасцянца, а таксама каб навуковая грамадскасць як мага хутчэй атрымала спецыяльнае навуковае даследаванне на гэту важную тэму ваеннай гісторыі і культуры памяці ў Беларусі.

*Поступила в редакцию 27.03.2023*

[1] Выступление Президента Беларуси Александра Лукашенко на памятном мероприятии, приуроченном к 80-летней годовщине хатынской трагедии // СБ. Беларусь сегодня. – 2023. – 23 марта. – С. 2.